**Методические рекомендации по популяризации творчества писателей-земляков юбиляров 2023г.**

Деятельность библиотек по литературному краеведению осуществляется по нескольким основным направлениям.

**Формирование краеведческого фонда.**

Библиотеки должны вести работу по сбору, сохранности и распространению краеведческой информации, обеспечить доступность краеведческих информационных ресурсов, распространение знаний о литературе края, популяризации произведений местных авторов.

**Подготовка и издание собственных краеведческих материалов.**

Дополнением к краеведческому фонду являются информационно-библиографические краеведческие ресурсы. Поэтому в целях пополнения своих краеведческих фондов библиотекам необходимо активно вести издательскую деятельность: сборники стихов, сценариев *«Родной земли многоголосье»*, *«Радасць мая адвечная - Камянецкая старана!»,* библиографические буклеты *«Писатель-земляк Коцік Ехезкель»,* памятки, закладки, листовки*“Вялікія імёны малой Радзімы”,* списки краеведческих новинок *«Зусім новыя кнігі».* Пополнять новыми материалами информационные фактографические папки-досье *«Призвание души» и т. д.*

**Создание комфортной информационной среды.**

С жизнью и творчеством знаменитых земляков познакомят информационные продукты: электронные презентации *«С любовью к малой родине», «Мы с этим именем живем, мы этим именем гордимся», “Літаратурная карта Камянеччыны», «Литературная Прочиталка», «Мои воспоминания» Е. Котик»,* медия-экскурсы *«Шляхамі акадэміка У.В. Гніламёдава»,* буктрейлеры *«Край родной, я тебя воспеваю»,* электронные папки-досье *«С любовью к родной земле».*

**Проектная деятельность.**

Примерные названия программ и проектов: *«Литературное пространство района», «Писатели-земляки - наша гордость», «ПоЧитаем земляка», «Писатели – уроженцы родного края», «На хвалі часу, у плыні жыцця», «Моя земля. Мои земляки»,* литературно-туристический проект *«Литературные тропы Каменетчины»* (экскурсии на родину писателей).

## Наглядная пропаганда.

Познакомить с творчеством писателей-земляков помогут:

тематические выставки *«Район литературный», «Живое слово Каменетчины», «Каменетчина, с любовью воспетая», «Родной земли многоголосье»*;

панорамные книжные выставки *«Поздравляем с юбилеем!», «Юбилей писателя – праздник для читателя!», «Малая мая радзіма, ты на свеце такая адна…»*, информационный стенд *"Літаратурны партрэт Каменетчины";*

книжные выставки-просмотры *«Родны край, навек любімы», «Любовью к родине дыша…», «Литературное наследие родного края», «Я вітаю цябе, незабыўны мой кут», «Край, адкуль мы родам», «Жыву і дыхаю, мой родны край, табою», «Жизнь. Творчество. Судьба»;*

выставки-презентации: *"Іх імёны праславілі литаратуру", «Литературные имена 2023 года»;*

выставки-знакомства: *«Литературные имена Каменетчины», "Літаратурнае сузор'е Камянеччыны";*

выставка-совет *"Адкрый для сябе паэта".*

выставка одной книги: *"Знаёмцеся, новае выданне!", «Встреча, которую ждали»;*

персональные выставки: цикл выставок из серии *«Литературный календарь»* познакомит читателей с творчеством поэтов и писателей нашего родного края: *"Отмечаем юбилей писателя", «Писатели родного края – юбиляры», «Юбилей писателя – праздник для читателя»;*

выставка одного автора, выставка-портрет *«Открой для себя книгу писателя-земляка-юбиляра», «На далонях лёсу" (выставка произведений члена СПБ)*;

выставка-поздравление *"З днём нараджэння, пісьменник!"*;

выставка-автограф *«Надпись на книге: судьба, эпоха…».*

## Культурно-просветительская и досуговая деятельность.

**Акции:** районная акция *«Читаем книги наших земляков», «Читаем Жуковича вместе»,* поэтические акции *«Возьми поэзию с собой»* и др. Литературная акция *«Читаем вместе с писателем»!»* презентация о жизни и творчестве писателя *«Писатель-земляк - »,* которая знакомит гостей с талантом писателя. Просмотр слайдов сопровождается чтением отрывков из произведений писателя.

Акция *«Вы не знакомы с творчеством (фамилия, имя, отчество писателя)?» Тогда мы идем к вам!».*

**Неделя краеведческой книги** включает: выставки, беседы, конкурсы, литературные вечера, литературные гостиные, литературные уроки, литературно-краеведческие часы, комментированное чтение *«Честный разговор о жизни, о себе», «Я родом из деревни»* и др.

Среди форм работы большой популярностью у читателей будут пользоваться **туристические поездки и походы по литературным местам, литературно-туристические маршруты** *«Литературные маршруты Каменетчины», «У. Гніламёдаў пісьменнік зямлі Камянецкай»*, «Шляхамі акадэміка Гніламёдава».

**«Литературные пятницы» или «Краеведческие среды»,** организованные в библиотеках, в центре которых будет творчество писателя-земляка, покажут многоаспектную, активную работу библиотек по продвижению чтения их произведений.

**Дни информации** *«Книжные новинки нашего региона», «Литературная карта Каменетчины»*, «Краеведческая мозаика».

**Дни краеведческой книги, Дни литературного краеведения:** *«И долговечно царство слова», «Читаем книги земляков», «Литературное слово Каменетчины», «Литературная жизнь края», «Край в творчестве писателей Каменетчины», «Литературное лицо малой Родины», "Душа належыць роднай зямлі", "Пісьменнік пачынаецца з Радзімы".*

**Встречи с писателями-земляками, литературные знакомства, литературные портреты, бенефисы писателей, поэтов:** *«Жизнь. Творчество. Судьба», "Аўтар, якога чытаюць сёння", «День с писателем», «Дар, што дадзены лёсам", "Паэзія роднага краю гучыць у душы зноў і зноў","Тут мае продкі, мае вытокі",«Если душа родилась крылатой…».*

**Краеведческие чтения:** *«История Каменетчины в художественной литературе», «Здесь Родины моей начало» (по произведениям местных авторов.)*

**Праздники белорусской книги** *"Роднае слова — родная песня", «Паэтычны свет В. Жуковича».*

**В рамках Недели пропаганды белорусской литературы:** выставки *"Чараўніца з краіны дзяцінства", "Няхай вам дапаможа казка"* (по творчеству Н. Кухлич), громкие чтения *«Чытайце, смейцеся, здзіўляйцеся» (к юбилею И. Житко), «Чтение с увлечением», «Книга-юбиляр - ……..».*

Конкурсы**:** викторина о жизни и творчестве писателя *«Майстар літаратурнага слова"*; конкурс рисунков по произведениям

писателей *«Родного края облик многоликий»;* творческий конкурс *«Письмо любимому писателю»;* конкурс чтецов, инсценировок *«О малой родине с любовью».*

Литературные вечера: *«В городе теплых сердец свечи в душах зажглись…», «Я родом з тых мясцін лясных…», "Слаўна зямля землякамі», "Даследчык прозы", "Геніальны сын зямлі Камянецкай", "У. Стэльмах: сцежкамі жыцця", "Пісьменнік. Час. Жыццё. Творчасць", Жыццёвымі фарбамі", «Край родной – гордость моя», «Натхненне ад малой Радзімы», «Есть в Беларуси уголок, милый сердцу городок…», «Волшебные места, где я живу душой», «Здесь моя земля, мой исток, мой родной...», "Мой край родной - славлю тебя", "Многогранный талант земляков".*

Вечер-портрет *"У.В. Гніламёдаў: Жыццё і творчы шлях",* вечера-встречи *«Писатель щедрого сердца», «Душой написанные строки», "Мастацкі свет В. Пракаповіч". В*

Вечер-интервью *«Поэтические откровения Я. Дашынай», "Майстар мастацкага слова".* Вечер памяти *«Учитель. Писатель. Краевед»* (посвященный творчеству Г.С. Мусевичу).

Литературные посиделки: *«Прекрасный мир прекрасного человека», «Женской поэзии мир необъятный», «Поэзия края родного в душе зазвучала вновь…», «Поэзия – родник волшебных слов и звуков»,*

Устный журнал *«Страницы поэзии края».*

Продвижению творческого наследия писателей-земляков будут способствовать видеочасы, видеогаллереи *«Пісьменники нашага краю»", "Гісторыя краю ў асобах", "Людзі, якія праславілі наш край»,* видеоэкскурс *"Усяму пачатак—родны край",* фоторепортаж *«Геральдист из Гремячей»* с праздника, посвященного юбилею земляка. Виртуальные творческие портреты, виртуальные знакомства, виртуальные выставки, виртуальные экскурсии, медиапросмотры с обсуждением.

Дни поэзии *«Свой край родной в стихах мы славим», «Источник вдохновения родной край», «О малой Родине с любовью», «Молодые таланты – городу», «А над усім – любоў да Беларусі», «Мастак у паэзіі: паэтычныя акварэль В. Жуковіча», «Роднай Беларусі прысвячаецца», «Паэзія – цудоўная краіна»,"В.Жуковіч: мастак слова","Кахаю і веру: лірыка Н. Гарагляд", "Слова, якое акрыляе".*

Праздники поэзии, вечара поэзии, часы поэзии, диалоги о поэзии под названиями *«Гениальное ПРОчтение», "На літаратурным небасхіле Камянеччыны", «Родному городу*

*посвящается…», «С милым краем дышу заодно», «Певец земли родной», «Творя словами красоту»,* <u>поэтический коллаж</u> *“Аб той зямлі, дзе нарадзіўся”, “Чароўнае слова паэта”, «О малой родине стихами…», «Строку диктует чувство».*

<u>Конкурсы чтецов</u> - *«О малой родине стихами…», «Его поэзия жива» «Гимн родной земле», «Любимому краю посвящается».*

<u>Премьера книги, презентация новой книги</u> *«Откройте новую книгу».*

Среди методов распространения краеведческих знаний популярны л<u>итературно-краеведческий часы,</u> <u>литературные обзоры:</u> *“Малая радзіма ў творах пісьменнікаў”, «Свет малой Родины», «Уголок Отчизны я в душе своей сберег», «Созвездие творческих судеб», «Земля, что дарит вдохновенье», «Молодежи о писателях Каменетчины», «Каменетчина в поэзии и прозе», «Творчество писателей и поэтов Каменетчины».*

<u>**Литературное караоке**</u> *«Маленькая Родина в стихах и песнях»* (конкурс чтецов стихов местных поэтов с музыкальным сопровождением, соответствующим ритму и даже настроению стихотворения);

<u>**краеведческий калейдоскоп**</u> *«Литературная Каменетчина», "Здесь начало моей родины", «Родине посвящается», «Под сенью книг, во власти слова».*

<u>**Литературная эстафета**</u> *«Родной земли многоголосье»* проводится в каждой сельской библиотеке района: в них по очереди проходят встречи с местными литераторами.

<u>**Литературные постановки, театральные праздники**</u> читателям можно предложить принять участие в театрализованном прочтении сказок Н. Кухлич, по отрывкам из произведений В. Гниломёдова, В. Прокопович и др.

Активную литературно-краеведческую деятельность ведут <u>**клубы по интересам, литературные кружки и секции**</u> «Встреча», *«Увлекательное чтение».*

<u>**Литературные кафе,**</u> <u>**литературные гостиные, салоны общения**</u> *«Книжные разговоры», «Встречи в литературной гостиной».*

<u>**Музейная деятельность**</u>.

Многие библиотеки в рамках работы по литературному краеведению ведут музейную работу. В библиотеках работают <u>литературно-краеведческие мемориальные комнаты</u> писателей,

действуют литературные уголки, мемориальные уголки памяти, оформляются историко-литературные экспозиции *«Но время не сметет моей строки»*, посвященные творчеству местных писателей. Музейная экспозиция *«В часы вдохновения»* будет привлекать внимание посетителей своими редкими экспонатами. Разделы экспозиции необходимо пополнять новыми экспонатами, в основном — книгами.

С целью популяризации творчества писателя в библиотеке необходимо проводить экскурсии с показом презентации *«Писатель, который сделал себя»*, книжно-иллюстративной выставки *«Мы с этим именем живем, мы этим именем гордимся»*.

**Использование различных видов рекламы** в работе библиотек.

Наиболее используемыми формами продвижения библиотеки на внешнем рынке информационных услуг являются: продвижение в печатных СМИ и на радио, продвижение через Интернет – через социальные сети, официальные сайты библиотек, выпуск рекламной продукции: *буклеты, путеводители, календари, закладки, программы, приглашения на библиотечные мероприятия*, посвященные творчеству писателей-земляков, выходу в свет их книг.

Библиотека должна стремиться к тому, чтобы стать полноценной объединяющей территорией для всех, кто занимается изучением и продвижением творчества писателей-земляков, чтобы новые достижения в этой области стали достоянием широкой публики.

## Ярына Дашына, паэтка

Да ліку перспектыўных паэтычных талентаў прыпушчанскага краю належыць Ярына Дашына, якая нарадзілася 4 кастрычніка 1978 года ў в. Ставы. Імя паэткі даўно вядома аматарам сучаснага прыгожага пісьменства па шматлікіх публікацыях у такіх выданнях, як "Літаратура і мастацтва", "Першацвет", "Полымя", "Маладосць", "Правінцыя", "Тэрмапілы" і многіх іншых. Цікавасць да літаратуры, імкненне выявіцца ў паэтычнай творчасці ўзніклі рана. Ужо ў школьныя гады ў вёсцы Клейнікі Брэсцкага раёна стала наведваць студыю "Спадчына", якой кіраваў Мікола Пракаповіч. Пасля атрымання сярэдняй адукацыі Ярына Дашына паступіла на філфак Брэсцкага універсітэта.

Літаратурнае асяроддзе актывізавала яе творчыя памкненні. Яна прымае ўдзел у рэспубліканскім конкурсе маладых літаратараў "Дэбют", на якім атрымала Гранпры імя Яўгеніі Янішчыц. Непасрэдныя кантакты з літаратурнай моладзю ў час творчых семінараў на радзіме, ва Украіне і ў Польшчы развівалі цікавасць да здабыткаў сучаснай сусветнай паэзіі, да вызначэння ў ёй свайго месца. На час вучобы ва універсітэце (1996-2001) прыпадае і выхад у абласны друк 1999г. у калектыўным зборніку "Дзядзінец: Паэзія Берасцейшчыны” была змешчана падборка вершаў Ярыны Дашынай "Тая, што з вамі - не я...".

Спектр праблемаў, якія цікавяць паэтку, шырокі. Яе хвалюе лёс Бацькаўшчыны, захапленні маладосці, маральныя ідэалы сучаснікаў. Асабліва ўражвае негатыўнае ўспрыманне Ярынай Дашынай духоўнага стану сучаснага грамадства.

Радуе тое, што захапленне паэзіяй у маладога творцы, якое жывілася лагічным асяроддзем у студэнцкія гады, літаратурнымі ўзаемаадносінамі ў студыі "Спадчына" абласнога Цэнтра творчасці моладзі, не знікла. Яна піша і цяпер, працуючы ў краязнаўчым аддзеле абласной бібліятэкі г. Брэста. Яе апошнія творы надрукавалі аўтарытэтны высокапатрабавальны часопіс “Дзеяслоў", і іншыя рэспубліканскія выданні, падборка вершаў выйшла ў Аўстрыі, дзе імя нашай зямлячкі значылася побач з такім мэтрам у беларускай паэзіі, як Алесь Разанаў. Вершы Ярыны Дашынай перакладзены таксама на рускую, балгарскую мовы. Напрыканцы 2007г. у выдавецтве "Літаратура і мастацтва” выйшаў яе першы паэтычны зборнік "Графіці на сэрцы".

Ярына Дашына - паэт стыхійны, які паддаецца імгненнаму водбліску пачуцця, але ў той жа час яе творам характэрны выразны інтэлектуальны пачатак. Творы Ярыны глыбока інтымныя. Лірычнае «я» Ярыны Дашынай жыве ў сваім, у значнай ступені адасобленым свеце. Яно, з аднаго боку, дыстанцуецца ад натоўпу, а з другога боку, усведамляе сябе яго часцінкай, імкнецца вырвацца з яго і ў той самы час адчувае з ім унутраную повязь. Лірычны суб’ект паэткі пратэстуе супраць сваёй уласнай шараговасці.

Ярына Дашына - аўтар падборкі вершаў «Тая, што з вамі – не я…» надрукаваных у зборніку «Дзядзінец» (1999), паэтычнага зборніка «Графіці на сэрцы» (2007).

**Аб жыцці і творчасці Я. Дашынай:**

Ярына Дашына // Літаратурная карта Берасцейшчыны / укл. А. Крэйдзіч.- Брэст: ААТ «Брэсцкая друкарня», 2008. - С. 298 – 300.

Дашына, Я. Вершы / Ярына Дашына // Непрыдуманыя партрэты: Мастакі і літаратуры, народныя майстры і дойліды Берасцейшчыны / Лявон Валасюк. - Брэст, 2014. - С. 216-217.

Валасюк, Л. Графіці на сэрцы : [пра паэтэсу Я. Дашыну] / Лявон Валасюк // Непрыдуманыя партрэты: Мастакі і літаратары, народныя майстры і дойліды Берасцейшчыны / Лявон Валасюк. - Брэст, 2014. - С. 216.

## Наталля Кандрашук, паэтка

Наталля Кандрашук нарадзілася 3 кастрычніка 1973г. у вёсцы Каменюкі Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля школы закончыла Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт. Пасля трох год настаўніцкай працы, працуе журналісткай ў рэдакцыі часопіса «Крыніца жыцця». Вершы пачала пісаць у 11 год, першыя з іх былі надрукаваны ў раённай газеце «Навіны Камянеччыны. Зараз творы Н. Кандрашук друкуюцца ў многіх выданнях, увайшлі ў паэтычныя зборнікі: «Стихи современных поэтов» (2003г.), «Там, где ты»(2004г.), «У тебя на ладонях» (2008г.), «Вдохновение», «Зимний букет» (2010г.).

**Аб жыцці і творчасці Н. Кандрашук:**

1.**Кондрашук, Наталья**. Зимний букет: Стихи / Н.Кондрашук.- Брест : Альтернатива, 2010.- 128с.

2.**Кандрашук, Н**. Недзе ў залюстроўі: вершы / Наталля Кандрашук // Маладосць. - 2015. — №10. — С.66-67

3.**Кандрашук, Н. П**. Вершы / Наталля Кандрашук // Навіны Камянеччыны. - 2021. — 23 кастрычніка (№ 43). — С. 7.
4.**Кандрашук, Н. П**. Недзе ў залюстроўі: [вершы] / Наталля Кандрашук // Маладосць. - 2015. — № 10. — С. 66—67
5.**Кандрашук, Н. П**. Спадчына Багдановіча: [верш] / Наталля Кандрашук // Літаратура і мастацтва. - 2023. — 24 лютага (№ 8). — С. 8.
6.**Кандрашук, Н**. Пушчанская музыка верасня / Наталля Кандрашук; фота Алега Міхалюка // Навіны Камянеччыны. - 2022. — 1 кастрычніка (№ 40). — С. 16: фат
7.**Кандрашук, Н. П**. Цяпер пазнала; Ноч; Спадчына Багдановіча; Да маёй Беларусі; Дзве радзімы : [вершы] / Наталья Кандрашук // Навіны Камянеччыны. - 2022. — 26 лютага (№ 16). — С. 16.

## Святлана Леанідаўна Курылёва, пісьменніца

(1928 – 2011)

Святлана Леанідаўна Курылёва – вядомая на Брэстчыне пісьменніца і публіцыст. Яе творам уласцівы душэўная паэтычнасць, натхненне, асаблівая патаемнасць, здольнасць бачыць дэталі ў час стварэння агульнай карціны.

Курылёва Святлана Леанідаўна нарадзілася 25 красавіка 1928 г. у горадзе Жытоміры (Украіна) у сям'і ваеннаслужачага. У пачатку Вялікай Айчынный вайны бацька памёр ад туберкулёзу, разам з маці Святлана была эвакуіравана ў Перм, затым ў Казахстан. У 1944 г. вярнулася на Украіну. Скончыла сярэднюю школу ў Харкаве.

У 1945 г. паступіла на рускае аддзяленне філалагічнага факультэта Харкаўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, пасля сканчэння якога ў 1950 годзе накіравана на працу ў Беларусь. Святлана Курылёва 33 гады выкладала рускую мову і літаратуру ў сярэдняй школе №1 г. Камянца.

Друкавацца пачала ў 1952 г. Спачатку – у брэсцкай абласной газеце «Заря», з 1960 г. у рэспубліканскім і саюзным друку. Пісала на рускай мове. Як пісьменнік яна заявіла пра сябе апавяданнем «Дорога», якое было упершыню апублікавана ў часопісе «Юность» (Масква, 1960). Пазней гэта апавяданне было перакладзена на некалькі моў, у тым ліку і на кітайскую. Святлана Курылёва аўтар кніг, апавяданняў, аповесцей «Жаворонки на улице» (1965), «И нелегко и непросто» (1975), «Формула успеха» (1979), «День председателя» (1980), «Доброта» (1983), «Самый короткий день»

(1987) і кнігі-дыялогу «Совхоз-комбинат «Беловежский»: сегодня и завтра» (з Ю. Марозам, 1990).

З 1980 г. – член Саюза пісьменнікаў СССР, з 2006 г. – член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Узнагароджана медалём "2000 гадоў хрысціянства". Лаўрэат прэміі Саюза кінематаграфістаў.

Святлана Курылёва пісьменнік-рэаліст і пісьменнік-рамантык. Сваёй творчасцю яна дапамагла пачуць і зразумець час 50-80 гадоў, улавіць пульс таго часу калі ставіліся і вывучаліся новыя праблемы, з’яўляліся новыя героі. У сваіх творах Святлана Курылёва заўсёды імкнулася да праўды жыцця. Асноўная тэма яе творчасці – побыт, жыццё і праца людзей вёскі. Большасць сваіх твораў пісьменніца прысвяціла моладзі і на працягу ўсёй творчай дзейнасці распрацоўвала гэтую тэму. У апошні час пісьменніца выступала выключна ў ролі публіцыста, супрацоўнічала з абласнымі і рэспубліканскімі газетамі. Як публіцыст яна адгукалася на балючыя тэмы: эканамічныя і духоўныя, якія выклікалі дыспуты чытачоў.

У пісьменніцкім стале Святланы Леанідаўны засталося шмат рукапісаў: раманаў, аповесцяў, апавяданняў, п’ес, казак для дзяцей, якія, верыцца, будуць надрукаваны ў выдавецтве і знойдуць дарогу да чытача.

18 лістапада 2011г. на 83-м годзе жыцця перастала біцца сэрца Святланы Леанідаўны Курылёвай, выдатнай пісьменніцы і публіцыста.

## Творы С. Л. Курылёвай

1.**Доброта**: повести / С. Л. Курылёва. Мінск : Мастацкая літаратура, 1983. 222 с.

2.**Жаворонки на улице**: рассказы / С. Курылева. Мінск : Беларусь, 1965. 191 с.

3.**Самый короткий день**: повесть и рассказы / С. Л. Курылева. Мінск: Мастацкая літаратура, 1987. 223 с.

4.**Формула успеха**: очерки / С. Л. Курылева. Мінск: Мастацкая літаратура, 1979. 176 с.

5.**Голубые глаза** : [рассказ] / Святлана Курылёва // Песні Белавежы: Камянеччына літаратурная: проза, паэзія, публіцысціка / уклад. З. Дудзюк. Мінск: Мастацкая літаратура, 2005. С. 236-242.

6.**Билеты в театр**: рассказ / Светлана Курылева // Навіны Камянеччыны. - 2017. — 15 ліпеня (№ 28). — С. 26.

7.**Колодец**: рассказ-быль / Светлана Курылева // Навіны Камянеччыны. - 2017. — 10 чэрвеня (№ 23). — С. 22.

8.**Народ против**: глава из повести "Генный расклад" / Светлана Курылева // Навіны Камянеччыны. - 2017. — 22 красавіка (№ 16). — С. 22.

9.**Семнадцатое лето**: рассказ / Светлана Курылева // Навіны Камянеччыны. - 2017. — 17 чэрвеня (№ 24). — С. 8.

10.**Стихи:** рассказ / Светлана Курылева // Навіны Камянеччыны. - 2017. — 26 жніўня (№ 34). — С. 22-23.

11.**Дворовый диктатор** : рассказ / Светлана Курылева // Заря. 1985. 11 апр.

12.**З раніцы да вечара і круглы год…**: нарыс / Святлана Курылёва // Ленінец. 1978. 1 жніўн. С. 3.

13.**Зайздрасць:** нявыдуманая гісторыя / С. Курылёва // Навіны Камянеччыны. 2001. 12 верас.

14.**Крылатые соседи**: [рассказы о птицах] / С. Курилева // Заря. 1980. 6 сент.

15.**Куфэрак**: нявыдуманая гісторыя / С. Курылёва // Навіны Камянеччыны. 2002. 21 жніўн.

16.**Мыла**: нявыдуманая гісторыя / С. Курылёва // Навіны Камянеччыны. 2003. 5 сак.

17.**На практике**: рассказ / Светлана Курылева // Заря. 1990. 26 апр.

18.**Не адзінока:** нявыдуманая гісторыя / С. Курылёва // Навіны Камянеччыны. 2002. 17 крас.

19.**Нясі свой крыж:** нявыдуманая гісторыя / С. Курылёва // Навіны Камянеччыны. 2007. 7 лют.

20.**Пабочны сынок:** нявыдуманая гісторыя / С. Курылёва // Навіны Камянеччыны. 2003. 30 жніўн.

21.**Приблудный**: рассказ / Светлана Курылева // Заря. 1981. 6 янв.

22.**Прыдуманы не мною:** нявыдуманая гісторыя / С. Курылёва // Навіны Камянеччыны. 2003. 23 крас.

23.**Прымірэнне:** нявыдуманая гісторыя / С. Курылёва // Навіны Камянеччыны. 2000. 7 чэрв.

24.**Сіла слова:** нявыдуманая гісторыя / С. Курылёва // Навіны Камянеччыны. 2003. 23 крас.

25.**Ці лёгка быць бацькам?**: апавяданне / Святлана Курылёва // Навіны Камянеччыны. 1992. 12 снеж.

26.**Шляхціц**: нявыдуманая гісторыя / С. Курылёва // Навіны Камянеччыны. 2002. 22 мая.

27.**Быць запатрабаванай :** нататкі публіцыста: [аб пенсійным узросце] / Святлана Курылёва // Навіны Камянеччыны. 2007. 5 снеж.
28.**Во саду ли, в огороде**: [деревенская тема в современной литературе] / С. Курылева // Беларуская думка. 2007. № 8. С. 165-168.
29.**Каб зло не кранула душу**: нататкі публіцыста / Святлана Курылёва // Навіны Камянеччыны. 2006. 2 чэрв.
30.**Лёс трох народаў**: нататкі публіцыста: [аб узаемаадносінах паміж трыма народамі ўсходніх славян] / Святлана Курылёва // Навіны Камянеччыны. 2008. 23 крас. С. 2.
31.**Переходный период**: [размышления писателя о молодом поколении] / Светлана Курылева // Заря. 2003. 1 февр.
32.**Подвиг учителя**: [о фильме «Обелиск», созданного по мотивам повести Василия Быкова] / С. Курылева // Заря. 1978. 22 ноябр.
33.**Сіндром выгарання**: [пра раман Сяргея Трафіменкі "Сіндром выгарання"] / Святлана Курылёва // Навіны Камянеччыны. 2007. 26 верас.
34.**Сотвори добро**: [о фильме «Портрет с дождем»] / С. Курылева // Заря. 1978. 25 марта.
35.**Устоять против сети** [о романе Ю. Полякова "Грибной царь", повести Н. Ивеншева "Едоки картофеля"] / С. Курылева // Беларуская думка. 2007. № 2. С.134-137.
36.**Фабрика телесериалов**: культура против антикультуры / Светлана Курылева // Беларуская думка. 2005. № 9. С. 152 – 157.

**Аб жыцці і творчасці пісьменніцы С. Л. Курылёвай**

1.**Курылева Светлана Леонидовна** // Кто есть кто в Республике Беларусь. 2005. / [под ред. И. В. Чекалова, автор составитель А.И. Котов]. Мінск: ООО Мэджик-Бук, 2005. Т. 2. С. 192.
2.**Курылёва Святлана Леанідаўна** // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. Мінск: БелЭн, 1999. Т. 9. С. 55.
3.**Курылёва Святлана Леанідаўна** // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал.рэд) і інш. Мінск: Беларус. Сав. Энцыклапедыя, 1986. Т. 3. С. 182.
4.**Курылёва Святлана** // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. Мінск, 1994. Т. 3. С. 573 – 575.
5.**Курылёва Святлана Леанідаўна**: [некралог, пісьменніца, (1928-2011г.ж.); біяграфія, фота] // Навіны Камянеччыны. 2011. 26 лістап. С. 15.

6.**Каменецкому району 70 лет**: брошюра: [биографические сведения о Светлане Курылевой] / Отдел идеологической работы Каменецкого районного исполнительного комитета. Каменец, 2010. С. 34.
7.**Літаратурная карта Берасцейшчыны**: [біяграфічныя звесткі пра Святлану Курылёву] / [уклад. А. Крэйдзіч]. Брэст: ААТ Брэсцкая друкарня, 2008. С. 281.
8.**Песні Белавежы**: Камянеччына літаратурная: проза, паэзія, публіцысціка: [біяграфічныя звесткі пра Святлану Курылёву] / уклад. З. Дудзюк. Мінск: Мастацкая літаратура, 2005. С. 301.
9.**Нарэйка, Н. М.** Святлана Курылёва: нататкі публіцыста / падрыхтавала Настасся Нарэйка // Навіны Камянеччыны. - 2015. — 4 ліпеня. — С.4.
10.**[Светлана Леонидовна Курылева]** : биография // Навіны Камянеччыны. - 2017. — 22 красавіка (№ 16). — С. 22; фот.
11.**Крэчка, Г.** Яе героі жывуць побач з намі: пісьменніцы Святлане Леанідаўне Курылёвай – 75: [аб жыцці і творчасці Святланы Курылёвай] / Галіна Крэчка // Навіны Камянеччыны. 2003. 23 крас.
12.**Кускевіч, І**. Формула поспеху: [аб кнізе Святланы Курылёвай “Формула поспеху”] / І. Кускевіч // Ленінец. 1980. 3 студз.
13.**Павлова, Л.** Долгий путь слова: последняя беседа со Светланой Курылевой / Любовь Павлова // Брестский курьер. 2011. 1 дек. С. 9.
14.**Скуратава, Т**. Прэм`ера новай кнігі пісьменніцы С. Л. Курылёвай / Т. Скуратава // Ленінец. 1987. 5 снеж.
15.**Слова на развітанне**: [словы спачуванняў у сувязі са смерцю Святланы Курылёвай] // Народная трыбуна. 2011. 26 ліст.
16.**Трибулева Е**. "Молчать о важном - преступление": каменецкий литератор Светлана Курылева – об участи "немодного" писателя / Елена Трибулева // Вечерний Брест. 2005. 2 сент. С. 4.

## Ніна Папова, паэтка
## (1939 – 2013)

Нарадзілася ў 1939 годзе ў вёсцы Лісоўчыцы Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Дзяцінства будучай паэтэсы было нялёгкім: бацьку замардавалі фашысты ў самым пачатку вайны, у маці засталося сямёра дзяцей. Апаленае вайной юнацтва было ўскладнена пасляваеннымі цяжкасцямі. Ніне з малых год прыйшлося дапамагаць маці падтрымліваць сям’ю і паспяваць вучыцца ў школе. Пасля заканчэння Вайскоўскай семігодкі ў 1956 годзе яна едзе ў шахцёрскі горад Інту (Комі АССР), дзе ўладкоўваецца на работу ў шахту і адтуль дапамагае сям’і матэрыяльна. Там яна атрымлівае атэстат аб

сярэдняй адукацыі, затым паступае ў Данецкі горны тэхнікум, дзе атрымлівае спецыяльнасць эканаміста.

У 1972 годзе вяртаецца на радзіму і працуе ў г. Брэсце. У 1985 годзе пераехала ў Крым, дзе пражыла да 1998 года. Потым зноў вярнулася ў Брэст. Першыя вершы пачала пісаць у пятым класе, але нясмелая і сарамлівая ад прыроды, так і не паказала іх настаўнікам.

Сур'ёзна адносіцца да літаратурнай творчасці стала пасля таго, як вярнулася з Інты на родную Брэстчыну. Вершы Ніны Рыгораўны публікавалі абласныя газеты "Зара", "Народная трыбуна", а таксама "Брэсцкая газета" і "Навіны Камянеччыны". Першая кніга вершаў "Невозможно не петь" выйшла ў 2009 годзе. Зборнік складаюць вершы, напісаныя ў розныя гады, прасякнутыя любо'ю да прыроды, да родных мясцін. Шмат пранікнёных радкоў прысвечана землякам і блізкім людзям. Шчырыя, добрыя пачуцці перапаўняюць аўтара зборніка. Дзе б не падарожнічала Ніна Папова, куды б лёс не кідаў дзяўчыну – любоў да паэзіі, як і любоў да сваёй малой Радзімы,

Вяртанне на радзіму для аўтара, як чалавека творчага, - гэта яшчэ і зварот да сябе, "даследаванне" ўласнага духоўнага свету. Нездарма ў раздзелах такая назва "Чтоб себя мне понять", "Каждому своё". У творчасці Н. Паповай адлюстроўваецца і горкая рэчаіснасць неперспектыўнай вёскі, і пранікнёныя пачуцці да мілага сэрцу куточка.

Нямала вершаў паэтка прысвяціла прыгажосці Крыма, яго цудоўнай прыродзе, дзе пражыла трынаццаць гадоў. Не забыла яна і пра горад свайго юнацтва Інту. Асабліва кранае верш "Прощай, Инта!" .У раздзеле "Посреди сиреневого мая", чытач знойдзе шмат рамантычных для сваёй душы вершаў "Непростая любовь", "Первая любовь", "Я вас любила", "Разлука".

"Возвращение" - другі паэтычны зборнік. У ім прадстаўлены вершы не толькі на беларускай і рускай мовах, але і пераводы. Разнастайныя па тэматыцы, ўсе яны пра час і пра сябе. Аб гэтым гавораць усе сем яго раздзелаў: "Радзіма кліча да сябе", "Родная земля", "Чем дольше я живу", "У степных Тавриды берегов", "И такая бывает любовь…", "Там, где пруд повенчался с калиною…", "Стихотворения для детей". Пра многае гаворыць ужо і сама назва зборніка, сціплая, аднаслоўная. Усе мы, як і лірычныя гераіні паэтэсы, час ад часу некуды вяртаемся. Найчасцей – у маладосць, у гады маленства. З гадамі і чым далей, тым больш – усё часцей хочацца абуць "чаравікі маленства", згадаць пра тыя часы, "калі дрэвы былі вялікімі", а бацькі - маладымі. Вяртанне для аўтара – гэта

і зварот да роднай мовы. Першыя спробы Ніны Паповай пісаць па-беларуску можна лічыць паспяховымі. Можа таму, што для яе на працягу ўсяго жыцця, нават удалечыні ад роднага дому, “беларуская гаворка чуецца”.

Літаратурная палітра паэтэсы багата ўсімі фарбамі жыцця і ў той жа час - простая, як само жыццё. Задушэўнасць, шчырасць, мяккі лірызм, меладычнасць, пошук гармоніі, палёт думкі, запал і разняволеныя фантазіі - вось асноўныя рысы яе паэзіі. Яднанне аўтара з прыродай, разуменне яе мовы, яе пачуццяў ператвараюцца ў непаўторныя пейзажныя замалёўкі. У кнізе ёсць раздзел пра любоў “И такая бывает любовь”, дзе шмат вершаў прысвечана пачуццям. Асаблівая тэма творчасці Н. Паповай – любоў да мілага сэрцу куточка, любоў да малой Радзімы.

Калі весці размову пра пейзажную лірыку, то мы бачым, што паэтка піша даверліва, сціпла, песенна…Запамінальныя, колерныя вобразы-штрыхі ляглі на паперу нібы ноты, і ў выніку загучала крыху тужлівая, але разам с тым светлая восеньская мелодыя.

У раздзеле “Стихотворения для детей” аўтар гаворыць пра цудоўную пару дзяцінства, праз вершы паказвае чытачу, як трэба выхоўваць у сабе беражлівыя адносіны да ўсяго жывога, паважлівасць і далікатнасць у адносінах са старэйшымі і іншыя станоўчыя якасці характару. У новым зборніку вершы маюць поўнае права прэтэндаваць на тое, каб прапісацца і жыць “на тэрыторыі Паэзіі”. Паэзія – гэта пошук існасці, гэта шлях да Бога. І калі чалавеку даравана нябёсамі ўменне майстэрскі абыходзіцца са словам, калі ў яго ёсць свой почырк, то ён проста абавязаны працягваць сваё ўзыходжанне ў бясконцы і бязмежны Свет паэзіі. Але, на жаль, у 2013 годзе Ніны Рыгораўны Паповай не стала.

### Аб жыцці і творчасці Н. Паповай:


1.**Попова, Н. Г.** Возвращение [Текст]: стихотворения / Н.Г. Попова. – Брест: Альтернатива, 2011. - 156 с.

2.**Попова, Н. Г**. Невозможно не петь [Текст]: стихи / Н. Попова. – Брест: Альтернатива, 2009. - 118 с.

3.**Попова, Н.** Белая вежа: стихотворение / Нина Попова // Навіны Камянеччыны. - 2012. — 8 верасня. — С. 5.


### Вера Паўлаўна Пракаповіч, паэтка, празаік, песенніца

Вера Паўлаўна Пракаповіч нарадзілася 12 сакавіка 1943 года ў вёсцы Малыя Мурыны Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці ў

сялянскай сям'і. У паэзію закахалася з дзяцінства, пісала вершы і апавяданні, але спачатку саромелася паказваць іх. Першае абуджэнне стваральнай душы, пробу пяра здольнай пяцікласніцы ахвотна надрукавала раённая газета "Іскра" (зараз "Навіны Камянеччыны"). Гэта акрыліла школьніцу і падбадзёрыла да творчасці. Атрымала сярэднюю адукацыю ў Камянецкай школе.

Скончыўшы школу, Вера выйшла замуж за свайго аднакласніка Сцяпана, які на той момант скончыў лётнае вучылішча грамадзянскай авіяцыі ў Арэнбургскай вобласці. Нарадзіліся дзеці, быў ад'езд за мяжу. Жыццёвыя клопаты не пакідалі месца паэзіі.

Па вяртанні на радзіму ў Веры Паўлаўны адкрылася "другое дыханне", жаданне пісаць стала патрэбнасцю. У сваіх творах яна апавядае пра чалавечую вернасць і каханне, шчодрасць і чуласць душы, вечныя хрысціянскія каштоўнасці, любоў да роднай зямлі, бацькоўскага куточка, па-мастацку і з даччынай любоўю вымалёўвае вобраз маці, адпрэчвае людскую няшчырасць, жорсткасць і фальш. Яе паэзія – вобразная, глыбакадумная, меладычная, па-жаночы шчырая і кранальная.

На творчым рахунку Веры Паўлаўны мноства вершаў і апавяданняў у перыядычным друку. Творы таленавітай аўтаркі друкаваліся ў часопісах "Маладосць", "Гаспадыня", "Алеся", "Акно", "Вместе", у калектыўных зборніках "Жырандоля", "Гоман", "Паэзія-2011".

Першая кніга вершаў Веры Пракаповіч "Незримой нитью" пабачыла свет у 2006 годзе. У зборнік разам з вершамі аўтар уключыла і навэлы. Далей друкаваліся зборнікі "Дорога домой" (2009), "Боль от любви" (2010), "Глазами жизни" (2014), "Вселенная любви" (2019), "Судьбы крутые виражи" (2020).

Вера Пракаповіч з'яўляецца членам Саюза пісьменнікаў Беларусі з 2006 года. Яна мае два Падзячных ліста ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 2010 годзе была намінавана на вышуканне літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Калесніка.

З паэзіяй Веры Паўлаўны знаёмы і ў Расіі. Пасля размяшчэння яе вершаў на расійскім літаратурным партале Стихи.ру, яе прыкмецілі і надрукавалі вершы ў літаратурным альманаху "Поэты России", намінавалася на прэмію "Паэт года Расіі". Узнагароджана Ганаровай граматай Саюза пісьменнікаў Расіі (2013).

Зараз Вера Паўлаўна жыве і займаецца творчасцю ў вёсцы Чэрні Брэсцкага раёна. Праводзіць творчыя сустрэчы, часта разам з сваім сынам. Зусім іншае гучанне знаходзяць вершы, пакладзеныя на

музыку і выкананыя сынам паэткі – спеваком і кампазітарам Аляксандрам Пракаповічам. "Уваскрашэнне любові!» - так называецца яго альбом, прадстаўлены на суд гледачоў. Наўрад ці б у кагосьці з кампазітараў атрымалася даць вершам лепшую музычную аправу. Аляксандр як ніхто разумее і адчувае матчыну душу, разам яны выдатна дапаўняюць адзін аднаго. Адбіваючы удары свайго лёсу, пісьменніца не можа заставацца абыякавай да лёсаў іншых людзей, таму тэм для творчасці ў яе яшчэ шмат. Няхай і далей яе аптымістычныя, светлыя паэтычныя радкі нясуць веру ў дабро і чалавечнасць.

## Творы В. П. Пракаповіч


1. **Прокопович, В. П.** Незримой нитью: стихи, новеллы / Вера Прокопович. - Брест: Академия, 2006. - 95 с.
2. **Прокопович, В. П.** Боль от любви: стихи / Вера Прокопович. - Брест: Альтернатива, 2010. - 112, [3] с.
3. **Прокопович, В. П.** Дорога домой: рассказы / Вера Прокопович. - Брест: Альтернатива, 2009. - 143 с.
4. **Прокопович, В. П.** Глазами жизни: [рассказы / Вера Прокопович. - Донецк: ЛАНДОН - XXI, 2014. - 277 с.
5. **Прокопович, В. П.** Вселенная любви: избранное / Вера Прокопович; [художник-иллюстратор Т. Обысова]. - Москва: Адвансед солюшнз, 2019. - 239 с., [4] л. ил.
6. **Прокопович, В. П.** Судьбы крутые виражи: непридуманные житейские истории / Вера Прокопович. - Брест: Альтернатива, 2020. - 206 с.
7. **Прокопович, В. П**. "Я вернулась в родные края..."; Приход весны; Голубка : [стихотворения] / Вера Прокопович // Берасцейская скарбніца: літаратурна-мастацкі альманах Брэсцкага абласнога аддзялення ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі" / составитель С. С. Мартынюк. - Вып. 2. — С. 121—123: фат. - Брест: Редакция Брестской областной газеты "Заря", 2019.
8. **Прокопович, В. П.** "Твой светлый образ в памяти храню..."; "И ложатся строчки на бумагу...": [стихотворения] / Вера Прокопович // Заря над Бугом. - 21 января (№ 3). — С. 7. - Брест, 2021.
9. **Прокопович, В. П.** "Хулиганит ветер озорной..."; "Я не люблю тебя, ты больше мне не нужен..."; "Ах, годы-годы, что же вы творите?.." : [стихотворения] / Вера Прокопович // Заря над Бугом. - 26 ноября (№ 48). — С. 9. - Брест, 2020.

10. **Прокопович, В. П.** "Спросил, куда ушли наши любовь и нежность..." : [стихотворение] / Вера Прокопович // Заря над Бугом. - 8 апреля (№ 14). — С. 9. - Брест, 2021.
11. **Прокопович, В. П.** Встреча: [рассказ] / Вера Прокопович // Навіны Камянеччыны. - 2021. — 2 студзеня (№ 1). — С. 17.
12. **Прокопович, В. П.** Материнское слово; "Спросил: куда ушли наши любовь и нежность?..": [стихотворения] / Вера Прокопович // Заря над Бугом. - 11 марта (№ 10). — С. 9. - Брест, 2021.
13. **Прокопович, В. П.** Еще не вечер : [стихотворение] / Вера Прокопович // Навіны Камянеччыны. - 2021. — 30 студзеня (№ 5). — С. 15.
14. **Прокопович, В.** "День за днем, неделя за неделей...": [стихотворение] / Вера Прокопович // Заря над Бугом. - 27 мая (№ 21). — С. 9. - Брест, 2021
15. **Прокопович, В. П.** "Добела раскалено светило..."; "Тихий шелест дождя..."; "Она его, как ангела, любила..."; "Облокотилась на забор устало..."; "Мой путь тернист, как и у многих женщин..." : [стихотворения] / Вера Прокопович // Навіны Камянеччыны. - 2021. — 17 ліпеня (№ 29). — С. 17.
16. **Прокопович, В. П.** "Осень красками своими..."; "Я вспоминаю годы детства славные..." : [стихотворения] / Вера Прокопович // Заря над Бугом. - 31 декабря (№ 53). — С. 9. - Брест, 2020.
17. **Прокопович, В. П.** "Не уходи, постой, уйти всегда успеешь...": [стихотворение] / Вера Прокопович // Заря над Бугом. - 22 октября (№ 43). — С. 9. - Брест, 2020.
18. **Прокопович, В. П.** "Страна моя многострадальная...": [стихотворение] / Вера Прокопович // Навіны Камянеччыны. - 2020. — 23 мая (№ 21). — С. 15.
19. **Прокопович, В. П.** "А знаете ли вы, мой генерал..."; "В тот день березку посадив..." : [стихотворения] / Вера Прокопович // Навіны Камянеччыны. - 2019. — 17 жніўня (№ 33). — С. 17.
20. **Прокопович, В. П.** Приход весны; Я вернулась в родные края; Тоска по юности: [стихотворения] / Вера Прокопович // Заря. - 2018. — 12 апреля (№ 42). — С. 18.
21. **Прокопович, В. П.** Домашняя кошка; "Ну, здравствуй, самый лучший..."; Освобождение; Обманщик; "Был успех..."; "Не смотрите на меня..."; "Дрожит на дереве..."; "Меня однажды ты наивною назвал..." : [стихотворения] / Вера Прокопович // Навіны Камянеччыны. - 2018. — 10 лютага (№ 6). — С. 20.

22. **Прокопович, В. П.** Всадница; Я могу любить и ненавидеть: [стихотворения] / Вера Прокопович // Навіны Камянеччыны. - 2018. — 6 студзеня (№ 1). — С. 26.
23. **Прокопович, В.** Запах скошенных дней; Родине; "Ах, какою немыслимой болью..."; Я вернулась в родные края : [стихотворения] / Вера Прокопович // Навіны Камянеччыны. - 2018. — 24 сакавіка (№ 12). — С. 6.

## Аб жыцці і дзейннасці В. П. Пракаповіч

1.**Мышленник, С.** Встреча с Верой / Светлана Мышленник // Навіны Камянеччыны. - 2020. — 14 сакавіка (№ 11). — С. 15.
2.**Прокопович, В. П.** "Лучшая награда — благодарность от президента" / Вера Прокопович; беседовали Максим Корхов и Эдуард Олиферук // Навіны Камянеччыны. - 2019. — 16 марта (№ 11). — С. 8 : фот.
3.**Уроки мудрости Веры Прокопович**: [о книге "Глазами жизни"] // Астрамечаўскі рукапіс. - № 4. — С. 68. - Брэст, 2014.
4.**Будкова, С.** "Дуэт Прокоповичей подарил минуты наслаждения" : [о творческой встрече с поэтессой Верой Прокопович в Страдечском доме культуры Брестского района] / Светлана Будкова // Заря над Бугом. - Брест, 2015. — 26 февр. (№ 9). — С. 8.
5.**Каменкова, М.** "Мне просто надо верить в чудо..." : [творческий вечер писательницы Веры Прокопович прошел в Брестском ООКЦ] / Марина Каменкова ; фото Александра Шульгача // Брестский вестник. - 2013. — 28 марта (№ 13). — С. 12.
6.**Бурдыка, В**. Паэзія болю і кахання: [пра вядомую берасцейскую пісьменніцу Веру Пракаповіч] / Вячаслаў Бурдыка // Народная трыбуна. - 2013. — 15 сакавіка (№ 11) — С. 3.
7.**Васільева, Н.** Раскажу я лепей вершам...: аб новай кнізе Веры Пракаповіч "Боль ад кахання" // Навіны Камянеччыны. - 2010. - 29 мая. - С. 4.
8.**Курец, А**. Книга с доброй душой : рецензия на книгу В. Прокопович "Дорога домой" // Заря над Бугом (Брест). - 2009. - 31 окт. - С. 5.
9.**Крейдич, А**. И автор близок, и герой: о новой книге В. Прокопович "Дорога домой" / А. Крейдич // Чырвоная звязда (Іванава). - 2009. - 4 верас. - С. 7.

# Юзаф Эдвард Пузына, гісторык, пісьменнік (1878 – 1949)

Юзаф Эдвард Пузына нарадзіўся 24 верасня 1878 годза ў маёнтку Грымяча, уладальнікам якога ў другой палавіне XIX стагоддзя быў Юзаф Пузына, прадстаўнік аднаго са старажытных родаў Вялікага княства Літоўскага.

У Грымячы прайшло дзяцінства Эдварда. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Варшаве, закончыўшы ў 1898 годзе гімназію. Пасля бацькавай смерці Эдвард Пузына стаў ўладальнікам Грымячы. У час навучання ў гімназіі Эдвард цікавіцца гісторыяй і літаратурай. Для паглыблення сваіх ведаў у гэтых галінах ён паехаў у Швейцарыю. Вучыўся ў Фрынбурскім універсітэце, дзе атрымаў вучоную ступень доктара філасофіі. У Швейцарыі Эдвард Пузына ажаніўся. У яго гадавалася чацвёра дзяцей.

Навуковыя зацікаўленні Эдварда Пузыны звязаны з геральдыкай. Ён даследаваў паходжанне і палітычную ролю князёў Вялікага княства Літоўскага. Навуковая гіпотэза Эдварда Пузыны выклікала шырокі розгалас сярод вучоных і прынесла яму еўрапейскую вядомасць. На пачатак XX ст. прыпадае актыўная літаратурная творчасць пісьменніка. У 1989 годзе у розных варшаўскіх выданнях апублікаваны яго першыя вершы. Пазней звяртаўся і да прозы. У 1905 годзе выйшаў першы зборнік Эдварда Пузыны “Агні”, у якім дамінавалі праблемы, характэрныя для юнацтва.

У час Першай сусветнай вайны Эдвард працаваў у Цэнтральным польскім агенцтве ў Лазанне, а пазней - у Польскім Народным Камітэце. Вайна актывізавала творчую дзейнасць пісьменніка. Выходзяць яго патрыятычныя творы: “Паэма сённяшняга дня”, “З пылам брацкая кроў", “Кракаўскае вяселле” і інш. Эдвард Пузына прадоўжыў класічныя традыцыі польскай рамантычнай паэзіі.

У 1919 годзе Эдвард вярнуўся ў Варшаву і працаваў ў Міністэрстве замежных спраў. Кар'ера чыноўніка яго не задавальняла. Пісьменнік пачаў выдаваць напаўафіцыйны часопіс “Messager Polonais” (1925), з'яўляючыся яго рэдактарам. Быў членам рэдкалегіі “Геральдычнага штомесячніка”, працягваў працу, звязаную з вывучэннем гісторыі Вялікага княства Літоўскага. У 1922 годзе Эдвард Пузына апублікаваў у Варшаве том сваіх вершаў “Па дарозе”, у які ўвайшлі творы, напісаныя ў 1895 - 1921 гг.

У пачатку 1930-х гг. Эдвард прадаў маёнтак у Грымячы. Пасля выхаду ў адстаўку ў 1933 годзе пераехаў ў Вялікую Бераставіцу на

Гарадзеншчыне і цалкам аддаўся навуковай і літаратурнай дзейнасці: пісаў вершы і прозу, шмат перакладаў, асабліва французскіх аўтараў.

Другая сусветная вайна застала пісьменніка ў Варшаве, дзе ён перажыў нямецкую акупацыю. У 1944 годзе працаваў у Чанхстахове кіраўніком аддзела культуры магістрата. Эдвард Пузына ўзяўся за напісанне мемуараў, прысвечаных сваёй зямлячцы Марыі Радзевіч. Кніга "Мае ўспаміны пра Радзевіч" была апошняй у творчай біяграфіі Эдварда Пузыны.

Юзаф Эдвард Пузына памёр 20 студзеня 1949 года у Чанхстахове, там і пахаваны.

## Аб жыцці і творчасці Эдварда Пузыны

1.**Пузына Юзаф Эдвард** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.6. Ч.1. С.5

2.**Пузына Юзаф Эдвард** // Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. 2 выд. Мінск, 2006 Т. 2. С. 474.

3.**Пузына Юзеф Эдвард** // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. Брестская область / редкол.: Т. В. Белова (гл. ред.) [и др.]. Минск, 2009. Т. 1, кн. 2. С. 292.

4.**Пузыны** // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Мінск, 1998. Т.13. С.118.

5.**Эдвард Пузына** // Літаратурная карта Берасцешчыны / укл. А. Крэйдзіч. Брэст : ААТ “Брэсцкая друкарня, 2008. С. 294–295.

## Мікалай Тур, паэт

Нарадзіўся 20 мая 1958 года ў в. Стрэлі, Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Па заканчэнні Пелішчанскай сярэдняй школы ў 1975 годзе паступіў у Краснадарскае вышэйшае ваеннае Чырвонасцяжнае вучылішча.

Праходжанне службы: 1972 - 1982 – памочнік начальніка штаба па спецсувязі і рэжыму сакрэтнасці 1300ЗРП 11ОА СПА (пас. Пагранічны Прыморскага краю).

1982 - 1985 начальнік 8-га аддзялення 277 МСД 5 ОА (в. Сяргееўка Прыморскага краю).

1985 - 1987 старэйшы афіцэр 8-га аддзела штаба 5 ОА (г. Усурыйск Прыморскага краю).

1987 - 1988 – старэйшы афіцэр 8-га аддзела штаба 3 ОА 3 ГВ (г. Магдэбург).

1988 - 1991 – слухач каманднага факультэту Ваеннай акадэміі сувязі ім. С. М. Будзённага (г. Ленінград).

1992 - 1994 – старэйшы афіцэр 8-га аддзела штаба 1ТА 3 ГВ (г. Дрэздэн). 1992 - 1994 – старэйшы афіцэр 8-га аддзела штаба 20 ОА 3 ГВ (г. Эбэрсвальдэ).

Звольнены з УС у 1994г. у сувязі з аргштатнымі мерапрыемствамі. Працоўная дзейнасць: У перыяд з 1994г. па наступны час працаваў на розных пасадах на прадпрыемствах г. Брэста і Брэсцкай вобласці. Грамадская дзейнасць: Удзел у спартыўна-масавых мерапрыемствах рознага ўзроўню. Майстар спорта СССР па ваенна-прыкладному віду спорта (ваеннае трохбор'е).

У 2012г. выдадзены паэтычны зборнік “Честь имею”. Гэта маніфест усёй творчасці аўтара, галоўнымі ідэямі якога з'яўляюцца патрыятызм, гонар, сумленне, любоў, вера. Чыстыя, ідучыя ад сэрца аўтара радкі, прыцягваюць чытача, застаўляюць задумацца аб сэнсе жыцця, аб вечных каштоўнасцях. Паэт шчыры ў сваіх творах, ён цвёрда ўпэўнены ў тым, аб чым піша, і заклікае сваіх чытачоў “быць на пярэднім краі, не хавацца за чужыя спіны”.

**Аб жыцці і творчасці М. Тура:**

1.Тур, Н. А. Честь имею [Текст]: стихотворения / Н. Тур. - Брест: Брестская типография, 2012. - 23 с.